ГАЗЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ АБЛАСНОЙ КААЛІЦЫІ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ

# Народны кантроль

№3
май
2009 года

КАМПАНІЯ – "ГРАМАДЗЯНСКІ КАНТРОЛЬ"

Калі вы ведаеце факты выкарыстання дзяржаўнымі пасадавымі альбо прыраўненымі да іх асобамі свайго службовага становішча для супрацьзаконнай дзейнасці, вы заўсёды можаце звярнуцца да сяброў аргкамітэта па стварэнню грамадскай арганізацыі "Камітэт грамадзянскага кантроля" па тэлефонах: (0222) 22-36-24, 22-28-07

### В БОБРУЙСКЕ СНОВА «ПОСАДИЛИ»…

Боруйским межгарнизонным военным судом за совершение преступлений, предусмотренных ч.2 ст.430 и ч.1 ст.455 УК Республики Беларусь, к 6 годам 6 месяцам лишения свободы с конфискацией имущества осужден бывший командир одной из воинских частей подполковник Н.

Предварительным и судебным следствием установлено, что он за взятку в размере 360 долларов США размещал на территории воинской части грузовой транспорт коммерческой фирмы без заключения договора.

Приговор вступил в законную силу.

### БЕЛАРУСЬ - "ОЧЕНЬ СЛАБАЯ" СТРАНА В БОРЬБЕ С КОРРУПЦИЕЙ

Согласно ежегодному отчету Global Integrity Index, Беларусь вошла в число стран, успехи которых в борьбе с коррупцией можно назвать «очень слабыми». В одной группе с Беларусью – Китай и Грузия. На последнем месте - Сомали.

Этот отчет с 2004 года публикует американская организация Global Integrity. В исследовании за 2008 год специалисты Global Integrity отследили ситуацию с коррупцией в 57 странах мира. Государства распределены в рейтинге по четырем подгруппам: страны с «сильным» индексом, «умеренные», «слабые» и «очень слабые».

Россия попала в группу стран со «слабым» индексом. Она следует после Аргентины и Турции. Ниже России в рейтинге «слабых» стран расположены Кения, Бангладеш, Молдавия, Киргизия, Сербия и другие страны.

В группе стран с «сильным» индексом: Польша, Болгария, Япония и Румыния.

В категорию «умеренных» стран, которую возглавляет Канада, входит также Казахстан.

# ЧЫЯ ПАПЕРА НА ШКЛОЎСКІМ СЬМЕТНІКУ?



На шклоўскі палігон цьвёрдых адкідаў звозяць вялікія скруткі паперы. Жыхар Шклова Міхаіл засьпеў гэты факт і фотаздымак даслаў "Свабодзе". Паводле спадара Міхаіла, адзін скрутак важыць каля тоны.

У аб'ектыў ягонай камэры патрапіла шэсьць скруткаў.

"Папера дабротная. Я ня ведаў, што папера такой якасьці не патрэбная нашай гаспадарцы. Уваход на палігон свабодны. Людзі патроху яе расьцягваюць сабе. Яна прыдатная для парнікоў, якіх у Шклове шмат. Аднак куды ты тону пацягнеш? Работнікі палігону закопваюць бульдозэрам гэтую паперу", — кажа спадар Міхаіл.

Высьветліць, чыя гэта папера, пакуль не ўдалося. У Шклове два прадпрыемствы, якія выпускаюць папяровую прадукцыю. У самім райцэнтры знаходзіцца папяровая фабрыка "Спартак". У райцэнтраўскім мікраёне Маладзёжны, за трыста мэтраў ад сьметніку, узьведзены завод газэтнай паперы.

**КДБ ЗАЦІКАВІЛІ ФАТАЗДЫМКІ СА СЬМЕТНІКУ**

Жыхара Шклова Міхаіла Кучарэнку, які сфатаграфаваў на мясцовым палігоне цьвёрдых адкідаў выкінутыя скруткі паперы, выклікалі ў міжраённую ўправу Камітэту дзяржаўнай бясьпекі.

Паводле спадара Кучарэнкі, зь ім гутарыў супрацоўнік Рады бясьпекі.

"Як яго завуць, я не запомніў, але ён назваўся менавіта супрацоўнікам Саўбезу. Мне ўручылі позву ля пад'езду майго дому. Сказалі, каб я ішоў у КДБ. Гутарыў супрацоўнік са мной ветліва. Ён запытаў, ці я фатаграфаваў паперу. Я адказаў, што я. Паводле яго, гэтая папера — ня шклоўскай вытворчасьці. Яе прывезьлі зь іншага прадпрыемства Беларусі. Я яму расказаў пра вядомыя мне факты карупцыі ў Шклове. Ён усё занатаваў і паабяцаў гэтыя факты праверыць. Паабяцаў ён таксама дзён празь дзесяць са мной сустрэцца зноў", — паведаміў "Свабодзе" Міхаіл Кучарэнка.

Спадар Кучарэнка на шклоўскім сьметніку сфатаграфаваў шэсьць скруткаў паперы. Паводле яго, кожны важыць каля тоны. Свой фотаздымак ён разаслаў у незалежныя сродкі масавай інфармацыі. Гэта, на ягоную думку, і сталася нагодай для выкліку ў КДБ.

*Радыё Свабода*

## ПРОКУРАТУРА ВОЗБУДИЛА УГОЛОВНОЕ ДЕЛО

Прокуратура Октябрьского района Могилева возбудила уголовное дело в отношении одного из руководителей ЖРЭУ областного центра, сообщили агентству «Интерфакс-Запад» в пресс-службе прокуратуры Могилевской области.

«Один из руководителей жилищно-ремонтно-эксплуатационного управления Могилева, вопреки интересам службы, с использованием служебных полномочий, заключил договор с одной из частных фирм на приобретение кровельной мастики на сумму около Br65 млн, без проведения тендера. С целью придания законности сделки дал указание подчиненным оформить подложные документы», - уточнили в пресс-службе облпрокуратуры.

Там добавили, что по этому договору ЖРЭУ излишне выплатило более Br42 млн.

По уголовному делу проводится предварительное расследование, проинформировали в пресс-службе облпрокуратуры.

*www.interfax.by*

WWW
http://ipcentr.org/
САЙТ ИНФОРМАЦИОННО-ПРАВОВОГО ЦЕНТРА

Народны кантроль

# ЧАРГОВЫЯ “РАЗБОРКІ” У “НОВАЙ ДРУЦІ”



ААТ “Новая Друць” - адна з буйнейшых і багацейшых гаспадарак Бялыніцкага раёна. Дзякуючы таму, што асноўным акцыянерам гаспадаркі з’яўляецца Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, гаспадарка не мае ніякіх праблем з забеспячэннем фінансавымі рэсурсамі, сярэдні заробак працаўнікоў таварыства нашмат перавышае заробак у іншых сельскагаспадарчых прадпрыемствах нашага раёна.

У апошнія месяцы гаспадарку пачалі літаральна “трэсці” праверкі з розных інстанцый. Так, толькі ў красавіку і траўні таварыства правяралі спецыялісты з КРУ і Камітэта дзяржаўнага кантролю. Па словах супрацоўнікаў адміністрацыі гаспадаркі, было выяўлена шэраг парушэнняў у фінансава-гаспадарчай дзейнасці, якія адносяцца да часу, калі кіраўніком ААТ “Новая Друць” быў Ігар Бондараў.

Нагадаю, што ў кастрычніку 2008 года Ігар Бондараў звольніўся з пасады дырэктара ААТ “Новая Друць” па ўласнаму жаданню. За добрую працу кіраўніцтва холдзінга “Мачулішчы”, куды ўваходзіць ААТ “Новая Друць”, узнагародзіла яго грашовай прэміяй і каштоўным падарункам.

Пераемнікам Ігара Бондарава на пасадзе кіраўніка гаспадаркі стаў дасведчаны “кадр” з Магілёўскай вобласці , былы старшыня Клімавіцкага райвыканкама Уладзімір Канавалаў. Уладзімір Вінідзіктавіч як раз незадоўга да гэтага выйшаў на волю з Шклоўскай калоніі, нейкі час папрацаваў у Клімавіцкім раёне і Расіі, а потым былыя сябры дапамаглі яму ўзначаліць ААТ “Новая Друць”. За краты спадар Канавалаў трапіў за перавышэнне службовых паўнамоцтваў у перыяд працы старшынёй Клімавіцкага райвыканкама, 5 студзеня 2005 года Гомельскі абласны суд прысудзіў яго да 4 гадоў пазбаўлення волі.

Па словах спецыялістаў гаспадаркі, новы кіраўнік адразу ж выявіў шэраг недахопаў. Невядома куды падзелася значная колькасць збожжа, вялікая колькасць зерня было прададзена камерцыйнай структуры, але грошы за яго на разліковы рахунак ААТ “Новая Друць” так і не прыйшлі. Дарэчы, за гэты “цікавы” выпадак былы кіраўнік гаспадаркі Ігар Бондараў абавязаны выплаціць ААТ “Новая Друць” 15 мільёнаў рублёў. Нагадаю, што раённая газета “Паходня”, якая выдаецца мясцовымі дэмакратычнымі актывістамі, неаднаразова пісала ў мінулым годзе пра тое, як добрае зерне з ААТ “Новая Друць” вывозілася на звалкі і ў лес на падкормку дзікам. Але якая справа нашым уладам да матэрыялаў апазіцыйнай газеты...

Як кажуць супрацоўнікі таварыства, новы дырэктар быў вельмі здзіўлены, колькі сродкаў пайшло на розныя нязначныя будаўнічыя аб’екты. Аб гэтым ён неаднаразова заяўляў сваім падначаленым, а ў хуткім часе пасля гэтага гаспадарку пачалі “трэсці” разнастайныя праверкі.

Сапраўды, мне асабіста вельмі дзіўна, чаму пры такой вялікай колькасці нарыхтаваных (на паперы) кармоў ужо з сярэдзіны зімы сянаж на корм жывёлам у ААТ “Новая Друць” завозілі з Віцебскай і Брэсцкай абласцей. Які пасля гэтага будзе сабекошт тога ж мяса і малака, цяжка нават уявіць...

Не ведаю, супадзенне гэта, альбо не, але ў красавіку Уладзімір Канавалаў трапіў у абласную бальніцу пасля таго, як у пад’ездзе дома на яго напалі і моцна пабілі невядомыя хуліганы. Кіраўнік “Новай Друці” да гэтага часу праходзіць курс лячэння, тыя, хто ажыццявіў злачынства, пакуль не знойдзены. Супрацоўнікі міліцыі ўхіляюцца ад адказу на пытанне аб падазраваных, працаўнікі таварыства лічаць, што дырэктар трапіў у бальніцу з-за таго, што шмат хацеў ведаць аб дзейнасці мінулага кіраўніцтва гаспадаркі і Бялыніцкага раёна. Будзем спадзявацца, што следства адкажа на ўсе пытанні.

Праверкі дзейнасці ААТ “Новая Друць” тым часам працягваюцца, што выклікае вялікае напружанне ў спецыялістаў гаспадаркі. Так, у сярэдзіне траўня з памяшкання канторы таварыства “хуткая дапамога” забрала ў бальніцу адну з супрацоўніц бухгалтэрыі. Па словах супрацоўнікаў КДК, вельмі шмат пытанняў у іх узнікае да дзейнасці былога галоўнага бухгалтара ААТ “Новая Друць”, былога кіраўніка Ігара Бондарава і шэрагу іншых спецыялістаў.

***Сяргей Семяновіч***

# В БЫХОВЕ ЗАДЕРЖАН СОТРУДНИК РАЙИСПОЛКОМА

Правоохранительными органами в Быхове при получении взятки задержан сотрудник райисполкома, сообщили агентству «Интерфакс-Запад» в пресс- службе прокуратуры Могилевской области.



«Один из сотрудников Быховского райисполкома неоднократно в ходе телефонных разговоров и личных встреч склонял местного жителя к даче взятки якобы для передачи судье суда Быховского района за благоприятное решение вопроса о назначении его гражданской жене минимального уголовного наказания по уголовному делу. В результате он получил от последнего $800», - уточнили собеседники агентства.

Управлением КГБ по Могилевской области в отношении сотрудника райисполкома возбуждено уголовное дело по признакам преступления, предусмотренного ч. 1 ст. 431 (получение взятки) и ч. 5 ст. 16 (подстрекательство к даче взятки) Уголовного кодекса Беларуси.

По уголовному делу проводится предварительное расследование следователем прокуратуры Могилевской области, проинформировали в пресс-службе.

*www.ipcentr.org*




ТЕЛЕФОН ДОВЕРИЯ: (0222) 22-36-24, 22-20-07
e-mail: narodnykamrol@gmail.com

Народны кантроль
Магілёўская абласная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна.
Выдавец: [illegible]
Надрукавана на [illegible] абсталяванні.
Бялыніцкі раён, в. Машчаніца, тэл. 37-110.
Рэдактар [illegible]
Наклад: 299 асобнікаў. Фармат А3. 2 старонкі